УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

Аб’ект аўтарскага права
УДК [069(1-21):069.8]+069.15(476+4)(043.3)

**КАВАЛЁВА**
**ЮЛІЯ ВІКТАРАЎНА**

# МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА Ў СУЧАСНАЙ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ: КАМУНІКАТЫЎНЫ АСПЕКТ

**Аўтарэферат**
дысертацыі на саіскание вучонай ступені
кандыдата культуралогіі
па спецыяльнасці 24.00.03 – музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя
гісторыка-культурных аб’ектаў

Мінск, 2023

Навуковая работа выканана на кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Навуковы кіраўнік: **Нароўская Ала Мікалаеўна**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Афіцыйныя апаненты: **Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Плытнік Кацярына Генадзьеўна,** кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры гісторыі і культурнай спадчыны Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава

Апаніруючая арганізацыя: Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

Абарона адбудзецца 27 красавіка 2023 г. а 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі ўніверсітэта; e-mail: buk@buk.by; тэлефон вучонага сакратара: 364-77-01.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 27 сакавіка 2023 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт Т. М. Бабіч

# УВОДЗІНЫ

Музеі гісторыі горада – гэта асобная група музеяў, якія вывучаюць гісторыю горада і, як правіла, носяць імя гэтага горада. Яны прэтэндуюць на ролю паўнавартаснага і ўплывовага ўдзельніка сацыякультурных працэсаў, выступаюць цэнтрамі захавання гарадской спадчыны і актуалізацыі гарадской памяці.

У дысертацыі разглядаюцца музеі гісторыі горада Беларусі ў кантэксце еўрапейскай музеязнаўчай традыцыі. Акцэнт на еўрапейскі рэгіён абумоўлены тым, што там з’явіліся першыя музеі гісторыі горада, якія сталі асновай і прыкладам для іншых падобных устаноў ва ўсім свеце. Сярод беларускіх музеяў асаблівая ўвага нададзена Музею гісторыі горада Мінска, які ўяўляе сабой музейнае аб’яднанне разнапрофільных экспазіцый.

Узаемадзеянне музея з сучаснай сацыякультурнай прасторай ажыццяўляецца праз рэалізацыю розных камунікатыўных практык і з’яўляецца важным фактарам умацавання сувязей з гарадскімі супольнасцямі. Камунікатыўная дзейнасць музеяў гісторыі горада характарызуецца шматвектарнасцю. Яны практыкуюць супрацоўніцтва не толькі з наведвальнікамі і гараджанамі, але і з разнастайнымі інстытуцыямі, якія звязаны з развіццём горада. Камунікатыўны аспект дзейнасці музеяў гісторыі горада пакуль не атрымаў комплекснага адлюстравання ў навуковай літаратуры.

Такім чынам, актуальнасць даследавання абумоўлена сучаснымі патрабаваннямі да трансфармацыі музеяў гісторыі горада пад патрэбы сацыякультурнай прасторы і гарадской супольнасці – наладжванне камунікацыі паміж музеем і горадам. Музей, які расказвае пра горад, выступае адным з тых інстытутаў, які праз гісторыю горада можа прадэманстраваць шляхі вырашэння сацыякультурных канфліктаў і стаць пляцоўкай грамадскага дыялогу.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Дысертацыя выканана ў межах праграм даследаванняў кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па тэме «Музеефікацыя гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: дасягненні і перспектывы» (№ ДР 20161947, зацверджана на Савеце ўніверсітэта 22.12.2015, пратакол № 4). Тэма дысертацыі адпавядае прыярытэтным напрамкам Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2030 г. (пратакол пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 10

ад 02.05.2017): п. 4.6 «Культура як крыніца духоўнага здароўя нацыі і сацыяльнай стабільнасці»; Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021–2025 гг. (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 29.01.2021 № 53): глава 6, падпраграма 1 «Культурная спадчына».

**Мэта, задачы, аб'ект і прадмет даследавання**

**Мэта даследавання** – выявіць асаблівасці камунікатыўнай дзейнасці музея гісторыі горада ў сучаснай сацыякультурнай прасторы.

Для дасягнення мэты даследавання пастаўлены наступныя задачы:

– удакладніць паняцце «музей гісторыі горада»;

– выявіць перыяды і фактары развіцця еўрапейскіх музеяў гісторыі горада;

– раскрыць тэндэнцыі развіцця музеяў гісторыі горада на тэрыторыі Беларусі;

– вылучыць напрамкі камунікатыўнай дзейнасці музеяў гісторыі горада ў сучаснай сацыякультурнай прасторы.

**Аб'ект даследавання** – музей гісторыі горада.

**Прадмет даследавання** – камунікатыўны аспект дзейнасці музея гісторыі горада ў сучаснай сацыякультурнай прасторы.

**Навуковая навізна**

У дысертацыі здзейснена комплекснае даследаванне камунікатыўнай дзейнасці музеяў гісторыі горада ў сучаснай сацыякультурнай прасторы. Удакладнена паняцце «музей гісторыі горада»; вызначаны перыяды станаўлення і развіцця еўрапейскіх музеяў гісторыі горада; выяўлены галоўныя тэндэнцыі развіцця музеяў гісторыі горада ў Беларусі на сучасным этапе, разгледжаны формы музеефікацыі гарадскога асяроддзя Мінска праз дзейнасць музея гісторыі горада; вылучаны напрамкі камунікатыўнай дзейнасці музея гісторыі горада ў сучаснай сацыякультурнай прасторы.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Музеі гісторыі горада ствараюцца з мэтай захавання і папулярызацыі гарадской гісторыка-культурнай спадчыны. Галоўнай іх асаблівасцю выступае аб'ект вывучэння – горад.

Вылучаюцца дзве катэгорыі даследуемых музеяў: гарадскія музеі гістарычнага профілю, якія вывучаюць і прадстаўляюць розныя храналагічныя этапы развіцця горада (захавалі ў сваёй назве слова «гісторыя»); гарадскія музеі комплекснага профілю, якія вывучаюць розныя аспекты жыцця горада і гараджан як у мінулым, так і ў сучаснасці (пазбавіліся ад слова «гісторыя» ў сваёй назве і скарацілі яе да варыянта «Музей горада N», дзе «N» – назва горада). Агульным для дзвюх катэгорый з'яўляецца іх прызначэнне – выявіць унікальныя рысы канкрэтнага горада, яго ідэнтычнасць. Аўтарская дэфініцыя паняцця «музей гісторыі горада» прапануецца з улікам характэрных рыс

даследуемай групы музеяў і суіснавання абедзвюх катэгорый. *Музей гісторыі горада – гэта сацыякультурны інстытут, які дакументуе, даследуе, захоўвае, інтэрпрэтуе, дэманструе гарадскую гісторыка-культурную спадчыну, выяўляе ўнікальнасць і ідэнтычнасць горада, імя якога ён носіць.*

2. Музеі гісторыі горада пачалі ўзнікаць у сярэдзіне – другой палове XIX ст. у Еўропе, што было абумоўлена наступнымі фактарамі: рост цікавасці да рэгіянальнай гісторыі і культуры; узмацненне працэсаў нацыянальнай ідэнтыфікацыі; урбанізацыя, якая прывяла да павелічэння колькасці і разнастайнасці музеяў; развіццё гістарычнай навукі, што садзейнічала фарміраванню ідэі аб неабходнасці захавання гісторыка-культурнай спадчыны горада.

Вылучаюцца наступныя перыяды эвалюцыі музеяў гісторыі горада: 1860-я гг. – 1918 г., 1919–1945 гг., 1946–1991 гг., 1992 г. – пачатак XXI ст. Прапанаваная перыядызацыя прыводзіцца на аснове крытэрыю гістарычнага развіцця з улікам сацыякультурных працэсаў фарміравання індустрыяльнага і постіндустрыяльнага грамадства, змен на палітычнай карце свету ў сувязі з сусветнымі войнамі і з'яўленнем новых дзяржаў і сталіц. У рамках дадзенай перыядызацыі назіраецца генезіс музеяў гісторыі горада, выразна акрэслены іх спецыфічныя рысы, якія найбольш праявіліся ў экспазіцыйнай рабоце і падыходах да самавызначэння. У працэсе эвалюцыі музеяў гісторыі горада адбылося змяненне канцэпцыі іх дзейнасці – ад сховішча музейных прадметаў да культурнага цэнтра, які выступае адным з фактараў фарміравання гарадской ідэнтычнасці.

3. Музеі гісторыі горада на тэрыторыі Беларусі развіваліся ў рамках агульнаеўрапейскіх тэндэнцый. Першыя музеі гісторыі горада ствараліся сіламі вучоных, актыўных грамадзян, грамадскіх аб'яднанняў (Мінскі гарадскі музей, Музей гісторыі горада Брэста). Гэта з'ўлялася пашыранай практыкай у пачатку – першай палове XX ст. Тэндэнцыямі развіцця дадзенай групы музеяў у адзначаны перыяд былі: камплектаванне фондаў прадметамі мясцовага паходжання (вытворчасці), усведамленне значэння гарадской гісторыі і важнасці яе захавання ў музеі. У другой палове XX ст. ствараліся музеі гісторыі новых прамысловых гарадоў (Музей гісторыі і культуры горада Наваполацка, Музей гісторыі горада Светлагорска), што абумоўлена грамадскай патрэбай у фарміраванні ўстойлівай гарадской супольнасці, гарадской ідэнтычнасці. Развіваючыся паралельна з ростам горада, такія музеі займаюцца дакументаваннем працэсаў сучаснасці і адлюстроўваюць іх у экспазіцыі. Большая частка беларускіх музеяў гісторыі горада адкрылася пасля 1992 г. Актуальнымі тэндэнцыямі развіцця дадзенай групы музеяў на сучасным этапе з'яўляюцца: пераарыентацыя з вывучэння гісторыі горада на яго ўсебаковае даследаванне як складанай сацыякультурнай з'явы; пашырэнне

камунікатыўных практык па ўсіх напрамках музейнай дзейнасці; рост уплыву на гарадскую сацыякультурную прастору праз засваенне музеем тэрыторыі горада.

4. Сучасны музей гісторыі горада з'яўляецца складанай камунікатыўнай сістэмай. Ён выконвае адразу некалькі роляў у працэсе камунікацыі: суб'ект, аб'ект, прастора. Музей гісторыі горада ператвараецца ў прастору дыялогу паміж гарадскімі супольнасцямі, гараджанамі і органамі ўлады, мінулым і сучасным.

Вылучаюцца два напрамкі камунікатыўнай дзейнасці ў музеі гісторыі горада: з наведвальнікамі і з інстытуцыямі. У аснове падыходу – прынцып функцыянавання музея гісторыі горада праз яго ўзаемадзеянне з навакольнай сацыякультурнай прасторай. Дадзенае ўзаемадзеянне мае зваротную сувязь, што стварае спецыфічную форму камунікацыі. З аднаго боку, музей займае пэўнае фізічнае становішча ў горадзе, а з другога, – уключаны ў сацыякультурную прастору горада. Пры гэтым музей можа аказваць значны ўплыў на развіццё гарадской прасторы. Гэта асабліва актуальна для тых музейных устаноў, якія пазіцыянуюць сябе як сацыякультурныя цэнтры з першаснай асветна-адукацыйнай функцыяй.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыя з'яўляецца вынікам самастойнага навуковага даследавання недастаткова вывучанай групы музеяў – музеяў гісторыі горада. Аўтарам вызначаны шляхі станаўлення такіх інстытутаў на тэрыторыі Беларусі і Еўропы, вылучаны храналагічныя перыяды эвалюцыі музеяў гісторыі горада, выяўлены іх спецыфічныя характарыстыкі, актуальныя тэндэнцыі развіцця на сучасным этапе. Здзейснена комплекснае даследаванне дзейнасці музеяў гісторыі горада Беларусі, раскрыта іх поліфункцыянальнасць. Адлюстравана спецыфіка інтэрпрэтацыі і прэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны горада ў сталічным Музеі гісторыі горада Мінска.

Прапанаваны напрамкі камунікатыўнай дзейнасці музея гісторыі горада ў сучаснай сацыякультурнай прасторы. Разгледжаны камунікатыўныя практыкі, якія ахопліваюць традыцыйныя віды дзейнасці музея: навукова-фондавую, навукова-экспазіцыйную і культурна-адукацыйную, а таксама сучасныя і спецыфічныя задачы прадстаўлення ўстановы ў сусветнай інфармацыйнай прасторы.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання адлюстраваны ў выступленнях на 24 навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: X, XI, XII, XIII, XIV, XV Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Культура. Навука. Творчасць» (Мінск, 12 мая 2016 г.; 4 мая 2017 г.; 3 мая 2018 г.; 16 мая 2019 г.; 14 мая 2020 г.; 13 мая 2021 г.); навуковых канферэнцыях

прафесарска-выкладчыцкага складу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (Мінск, 23 лістапада 2017 г.; 22 лістапада 2018 г.; 21 лістапада 2019 г.); XLII, XLIII, XLVII навуковых канферэнцыях студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў «Национальная культура глазами молодых» (Мінск, 22 сакавіка 2017 г.; 22 сакавіка 2018 г.; 17 сакавіка 2022 г.); XII Кангрэсе антраполагаў і этнолагаў Расіі (Іжэўск, 3–6 ліпеня 2017 г.); Міжнароднай выставе-канферэнцыі «E-Governance – инновационные технологии в управлении» (Мінск, 21 красавіка 2017 г.); VII Міжнародным кангрэсе даследчыкаў Беларусі (Варшава, 15–17 верасня 2017 г.); XII Міжнародных Купалаўскіх чытаннях (Мінск, 10 кастрычніка 2017 г.); Музейных чытаннях у рамках выставы «Беларусь: адраджэнне духоўнасці» (Мінск, 30 лістапада – 1 снежня 2017 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Научно-техническая документация в современном мире: роль, значение, перспективы. К 50-летию создания Белорусского государственного архива научно-технической документации» (Мінск, 24 мая 2018 г.); VIII Усерасійскай навукова-практычнай канферэнцыі «Родной край: история и современность» (Набярэжныя Чаўны, 19 красавіка 2018 г.); Міжнароднай канферэнцыі «Музеі ў XXI стагоддзі: новыя сэнсы, новая прастора, новыя вобразы» (Мінск, 9–10 красавіка 2019 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Библиотеки и музеи в современной образовательной и социокультурной среде: сохранение традиций и перспективы развития» (Мінск, 24–26 верасня 2019 г.); навукова-практычнай канферэнцыі «Центральный район – история и современность» (Мінск, 30 мая 2019 г.); VIII, IX Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Культура Беларуси: реалии современности» (Мінск, 10 кастрычніка 2019 г.; 8 кастрычніка 2020 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў 17 публікацыях аўтара, 4 з якіх апублікаваны ў навуковых рэцэнзаваных часопісах, уключаных у пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь (2,8 аўт. арк.), 9 – у навуковых зборніках (1,8 аўт. арк.), 4 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (1,3 аўт. арк.). Агульны аб’ём публікацый складае 5,9 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Структура дысертацыі змяшчае ўводзіны, агульную характарыстыку работы, асноўную частку, якая складаецца з трох глаў, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц, 5 дадаткаў, 10 актаў укаранення. Поўны аб’ём дысертацыі складае 156 старонак, з іх 114 старонак займае асноўны тэкст, 29 старонак – бібліяграфічны спіс (314 выкарыстаных крыніцы і 17 найменняў у спісе публікацый аўтара); 13 старонак займаюць дадаткі.

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** абгрунтаваны выбар тэмы, актуальнасць і навуковая навізна, вызначаны мэта, задачы, аб'ект і прадмет даследавання, адлюстравана сувязь работы з навуковымі праграмамі, сфармуляваны асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, прадстаўлены звесткі аб асабістым укладзе саіскальніка, апрабацыі і апублікаванасці вынікаў даследавання, структуры і аб'ёме дысертацыі.

**У першай главе «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання»** аналізуюцца тэарэтычныя распрацоўкі айчынных і замежных навукоўцаў, якія вывучаюць пытанні станаўлення і развіцця музея гісторыі горада ў сацыякультурнай прасторы, вызначаецца шэраг крыніц, якія выкарыстоўваліся пры распрацоўцы даследуемай тэмы, абгрунтоўваюцца метадалагічныя падыходы і метады, з дапамогай якіх вырашаліся пастаўленыя задачы. Разглядаецца фарміраванне дэфініцыі «музей гісторыі горада», сучасныя падыходы да зместу яго дзейнасці.

**У раздзеле 1.1 «Аналітычны агляд літаратуры і метадалогія даследавання»** сістэматызавана і прааналізавана літаратура па тэме дысертацыйнага даследавання. Навуковая літаратура падзелена на чатыры блокі. Першы блок складаюць работы, накіраваныя на асэнсаванне розных аспектаў сутнасці музея як інстытута сацыякультурнай памяці. Другі блок прысвечаны тэорыі музейнай камунікацыі. У трэці блок уключаны публікацыі, якія аналізуюць феномен музея гісторыі горада, працэс яго станаўлення і развіцця, узаемадзеянне з сацыякультурнай прасторай. У чацвёрты блок аднесены даследаванні, дзе разгледжаны асноўныя тэндэнцыі ў дзейнасці сучаснага музея гісторыі горада.

Пытанні навуковага асэнсавання сутнасці музея як сацыяльнага інстытута, яго грамадскага прызначэння разглядаліся ў працах музеёлагаў, культуролагаў, гісторыкаў і інш. Аналіз зместу музея, практыкі яго ўзаемадзеяння з грамадствам прыводзяцца ў даследаваннях Й. Бенеша, В. С. Сапанжы, А. І. Смоліка, З. Странскага, А. А. Сундзіевай, М. Ф. Фёдарава, Л. М. Шляхцінай і інш. Сацыякультурныя функцыі музея разглядаюцца ў працах У. Ю. Дукельскага, А. Б. Закс, Ю. П. Пішчуліна, Д. А. Равіковіч і інш.

Першыя даследаванні камунікатыўных працэсаў былі здзейснены ў канцы 1920-х гг. Р. Хартлі. Далейшае развіццё тэорыя камунікацыі атрымала ў работах К. Э. Шэнана, М. Маклюэна. У 1960-я гг. пытанні камунікацыі ўключаюцца ў кола музеязнаўства. Канадскі даследчык Х. Паркер першым прымяніў тэорыю камунікацыі да музея. Яго ідэі знайшлі працяг у даследаваннях Й. Бенеша, Д. Камерона, Ю. Ромедэра, З. Странскага, К. Хадсана, Э. Хупер-Грынхіл, К. Шрайнера. У савецкім музеязнаўстве камунікатыўны падыход пачаў

распрацоўвацца ў 1970-я гг. М. Б. Гнядоўскім, Ю. У. Дукельскім, А. Б. Закс. Сучаснае навуковае абгрунтаванне музейная камунікацыя атрымала ў працах такіх даследчыкаў, як Ю. У. Зіноўева, Ю. Э. Комлеў, М. Ю. Кражэўскіх, В. С. Сапанжа. Сярод айчынных даследчыкаў пытанняў музейнай камунікацыі вылучаюцца работы І. І. Бамбешкі, С. В. Гаўрылавай, К. Г. Плытнік. У дачыненні да музея гісторыі горада камунікатыўны падыход дазваляе выявіць асноўныя напрамкі камунікацыі, якія разглядаюцца ў дысертацыйным даследаванні.

Спробы вылучэння ў асобную групу музеяў гісторыі горада адзначаюцца ў пачатку – першай палове XX ст. у працах расійскіх даследчыкаў Л. А. Ільіна, І. Ф. Кларка, М. І. Раманава. У 1930-я гг. тэарэтычныя пытанні дзейнасці музея гісторыі горада аналізуюцца ў работах амерыканскага музеязнаўцы Дж. Ван Пелта. У 1950–1960-я гг. сярод нешматлікіх работ, якія сведчаць пра цікавасць да дадзенай групы музеяў, – даследаванні У. П. Нікаленкі, І. С. Рамаfor оўскага. Вывучэнне музеяў гісторыі горада актывізавалася ў 1990-я гг. з узнікненнем прафесійных асацыяцый. У 1996 г. выйшаў асобны нумар часопіса «Museum», цалкам прысвечаны праблемам музеяў гісторыі горада, якія разглядаюцца ў артыкулах Г. Бузінкай, Н. Джонсан, Э. М. Колінз, Б. Мелера, Н. Мерымана, М. Хебдзіча, К. Хейдэкена. З'яўляюцца манаграфіі, прысвечаныя гісторыі гарадскіх музеяў, сярод іх – работы расійскіх навукоўцаў Г. Р. Назіпавай, Л. І. Пятровай, польскай даследчыцы М. Папёлэк.

Аналіз матэрыялаў канферэнцый, арганізаваных CAMOC (Камітэт па калекцыях і дзейнасці музеяў гарадоў) у 2011–2021 гг. выявіў шэраг тэндэнцый і праблем музеяў гісторыі горада на сучасным этапе: выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій, пабудова пастаяннай экспазіцыі пра горад, міграцыя насельніцтва і яе ўплыў на музеі гісторыі горада, узаемадзеянне музеяў з гараджанамі.

Дзейнасць беларускіх музеяў гісторыі горада аналізуецца ў артыкулах айчынных даследчыкаў: А. Р. Агеева, Л. С. Батанавай, І. П. Водневай, С. В. Гаўрылавай, Т. А. Джумантаевай, В. Д. Краско, М. В. Куксёнак, У. П. Мякішава, А. В. Марзалюк, С. А. Тамчук. Дзейнасць Музея гісторыі горада Мінска асвятляецца ў артыкулах Г. П. Ладзісавай, Л. Г. Марковіч, В. С. Сідаровіча. Да гісторыі станаўлення музеяў гісторыі горада ў Беларусі звяртаюцца ў сваіх работах М. А. Бяспалая, А. А. Гужалоўскі.

Узаемадзеянне горада і музея даследуюць Я. А. Багатырова, Д. А. Бутакова, Н. І. Гаўрылава, А. А. Змяўл. Іміджавая функцыя музея разглядаецца ў артыкулах М. В. Арташкевіч, В. М. Асташкіна, Н. В. Карэлінай, А. В. Шчарбаковай. Вывучэннем тэорыі экспазіцыі музеяў гісторыі горада займаецца Т. П. Палякоў.

Такім чынам, у выніку гістарыяграфічнага аналізу публікацый па тэме даследавання можна адзначыць актуальнасць дадзенай праблематыкі, актыўнасць у вывучэнні асобных аспектаў функцыянавання музеяў гісторыі горада. Аднак пытанні камунікатыўнай дзейнасці музеяў гісторыі горада застаюцца недастаткова распрацаванымі.

Аснову крыніцазнаўчай базы даследавання склалі пісьмовыя крыніцы – заканадаўчыя і іншыя нарматыўныя дакументы, якія рэгламентуюць пытанні функцыянавання музеяў. Значную групу ўтвараюць матэрыялы справаводства, якія адлюстроўваюць практычную дзейнасць Музея гісторыі горада Мінска. На падставе матэрыялаў навуковых канферэнцый і семінараў, артыкулаў у перыядычных выданнях разглядаліся разнастайныя пытанні дзейнасці музеяў гісторыі горада. У асобную групу крыніц неабходна аднесці інтэрнэт-рэсурсы, якія з’яўляюцца інфарматыўнай крыніцай па актуальных напрамках дзейнасці музеяў гісторыі горада Беларусі і замежжа. Яны ўтрымліваюць разнастайныя матэрыялы апісальнага і ілюстрацыйнага характару, статыстычныя дадзеныя, навуковыя публікацыі і іншую інфармацыю.

*Тэарэтыка-метадалагічную аснову* даследавання складае міждысцыплінарны падыход, які інтэгрыруе стратэгіі музеалогіі, культуралогіі, гісторыі і іншых навуковых дысцыплін. Тэарэтычную базу даследавання ўтвараюць культуралагічны, камунікатыўны, генетычны, сацыялагічны падыходы. *Культуралагічны падыход* дазваляе разглядаць музей гісторыі горада, з аднаго боку, як частку культуры, а з другога – як з’яву культуры, якая ўзнікла ў выніку сацыякультурнага развіцця грамадства. *Камунікатыўны падыход* заснаваны на ўяўленні аб тым, што музей гісторыі горада – гэта камунікатыўная сістэма, а ўсе сацыяльныя працэсы ў музеі маюць камунікатыўны характар. *Генетычны падыход* выкарыстаны для даследавання ўзнікнення і развіцця музеяў гісторыі горада, дазваляе зрабіць храналагічны зрэз вывучаемага аб’екта. *Сацыялагічны падыход* мае важнае значэнне пры вывучэнні ўзаемадзеяння музея і грамадства, музея і гарадской прасторы.

У даследаванні выкарыстаны такія метады як тыпалагізацыя, гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, структурна-функцыянальны, семіятычны, аксіялагічны, дыяхранічны, сінхранічны, дыялектычны, культурна-антрапалагічны.

**У раздзеле 1.2 «Музей гісторыі горада: трансфармацыя дэфініцыі»** разглядаецца сутнасць паняццяў «сацыякультурная прастора» і «музей гісторыі горада». У дачыненні да тэмы дысертацыі асаблівую значнасць набывае вывучэнне сацыякультурнай прасторы ў даследаваннях, прысвечаных гарадской культуры. Сацыякультурная прастора горада ахоплівае розныя ўстановы культуры, сацыяльныя і культурныя супольнасці, якія ўзаемадзейнічаюць у яе межах. Сучасная даследчыца І. В. Туліганава ўключае

ў структуру сацыякультурнай гарадской прасторы гарадскую супольнасць, сацыяльныя інстытуты, сістэму норм і каштоўнасцей, традыцыі, сацыяльна-камунікатыўныя ўзаемадзеянні. Важным элементам сацыякультурнай прасторы горада з'яўляецца музей.

Навуковыя пошукі вызначэння паняцця «музей гісторыі горада» адносяцца да другой паловы XIX – пачатку XX ст., калі музеі дадзенай групы арыентаваліся на вывучэнне мясцовай гісторыі і захаванне спадчыны старога горада. Першапачаткова ў іх назве прысутнічала слова «гісторыя», напрыклад «Музей гісторыі горада N». У XXI ст. побач з класічнай назвай сустракаецца варыянт пазбаўлены слова «гісторыя» – «Музей горада N», што сведчыць пра трансфармацыю зместу і грамадскага прызначэння дадзенай групы музеяў. Беларускія музеі гісторыі горада захавалі класічны варыянт назвы, які выкарыстоўваецца ў дысертацыі.

Актывізацыя тэарэтычных даследаванняў, пошук вызначэння сутнасці музея гісторыі горада назіраліся ў канцы XX – пачатку XXI ст. і былі звязаны са з'яўленнем міжнародных прафесійных аб'яднанняў, такіх як Міжнародная асацыяцыя музеяў гарадоў (1995 г.), CAMOC (2005 г.). Аналіз артыкулаў спецыяльнага выдання часопіса «Museum» за 1996 г. дазволіў вызначыць асноўныя падыходы і тэндэнцыі далейшага развіцця музеяў гісторыі горада. Сярод іх можна вылучыць тры галоўныя. Першы, традыцыйны падыход, арыентаваны на прадстаўленне гісторыі горада ў музеі. Другі, найбольш актуальны, пераносіць арыенцір з гісторыі на сучаснасць і будучыню горада, тым самым пашырае гарызонты ў вывучэнні горада, адлюстраванні яго сутнасці ў музейнай экспазіцыі. Трэці падыход фактычна трансфармаваў музей як інстытут – са сховішча калекцый да культурнага цэнтра, адной з галоўных задач якога з'яўляецца наладжванне камунікацыі з гараджанамі.

У пачатку XXI ст. з'явіліся новыя падыходы да дэфініцыі «музей гісторыі горада». Найбольш лаканічнае вызначэнне прапанаваў С. Цілеманс, які адзначыў, што музей горада – гэта музей пра горад і ў горадзе. Тут ясна абазначаны аб'ект вывучэння – горад і яго месцазнаходжанне – горад, імя якога носіць музей.

Спроба сфармуляваць вызначэнне паняцця «музей гісторыі горада» на міжнародным узроўні была прадпрынята CAMOC у 2015 г. на майстар-класах у Берліне і Маскве. Па выніках работы даследчыкамі былі складзены шэсць розных вызначэнняў. Усе яны разглядаюць музей як пэўную культурную прастору, якая арыентавана на задавальненне патрэбы ў самаідэнтыфікацыі гараджан.

У выніку праведзенага аналізу існуючых дэфініцый, спецыфічных характарыстык музеяў гісторыі горада прапануецца аўтарскае вызначэнне. *Музей гісторыі горада – гэта сацыякультурны інстытут, які дакументуе,*

*даследуе, захоўвае, інтэрпрэтуе, дэманструе гарадскую гісторыка-культурную спадчыну, выяўляе ўнікальнасць і ідэнтычнасць горада, імя якога ён носіць.*

**У другой главе «Музей гісторыі горада: генезіс і эвалюцыя»** здзейснены аналіз перадумоў стварэння музеяў гісторыі горада, акрэслены перыяды іх фарміравання на тэрыторыі Беларусі і ў Еўропе.

**У раздзеле 2.1 «Міжнародны вопыт стварэння і развіцця музеяў гісторыі горада»** ў выніку абагульнення і сістэматызацыі значнага фактычнага матэрыялу былі вызначаны асноўныя перыяды станаўлення і развіцця згаданых музеяў, вылучаны прычыны іх узнікнення і грамадская неабходнасць.

На аснове аналізу працэсаў фарміравання музеяў гісторыі горада вылучаны тры групы: музеі, створаныя па ініцыятыве гарадскіх улад; музеі, створаныя на сродкі мецэнатаў або на базе прыватных калекцый; музеі, створаныя па ініцыятыве грамадскіх аб'яднанняў.

Музеі гісторыі горада, заснаваныя па ініцыятыве гарадскіх улад пачалі з'яўляцца ў другой палове XIX ст. Правобразам для іншых еўрапейскіх музеяў гісторыі горада XIX ст. стаў музей Карнавале, створаны ў Парыжы ў 1866 г. З'яўленне музеяў гісторыі горада было дэтэрмінавана ўрбанізацыяй і архітэктурнымі пераўтварэннямі горада.

Рост колькасці музеяў гісторыі горада ў 1919–1945 гг. быў абумоўлены распадам імперыялістычнага ладу, дэкаланізацыяй, з'яўленнем новых дзяржаў. У вылучаны перыяд такія музеі найперш ствараліся ў краінах, дзе адбываўся рух за нацыянальнае адраджэнне, афармлялася дзяржаўнасць: Балгарыя (Музей гісторыі Сафіі, 1928 г.), Польшча (Музей гісторыі Варшавы, 1936 г.), Эстонія (Талінскі гарадскі музей, 1937 г.).

Новыя музеі гісторыі горада актыўна фарміруюцца ў 1946–1991 гг. У гэты перыяд рэканструкцыя гарадоў была звязана з ліквідацыяй наступстваў Другой сусветнай вайны. Створаны Музей Сараева (1949 г.), Гарадскі музей Мітровіцы (1952 г.), Музей горада Афіны (1973 г.), Музей гісторыі горада Кіева (1978 г.), Музей сярэдневяковага Стакгольма (1986 г.).

Перыяд з 1992 г. да пачатаку XXI ст. – час пераходу ад індустрыяльнага да постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства. Новыя стратэгіі развіцця гарадоў, арыентацыя на сферу паслуг і індустрыю культурнага турызму садзейнічалі з'яўленню музеяў: Гістарычны цэнтр Хаген (1998 г.), Гарадскі музей Берліна (1995 г.), Гарадскі музей Бергена (2005 г.), Музей Кардзіфа (2011 г.).

Другая група музеяў гісторыі горада створана на сродкі мецэнатаў або на базе прыватных калекцый: Музей горада Бялграда (1903 г.), Музей Старога Манака (1924 г.), Гарадскі музей Любляны (1935 г.). Такія музеі актыўна фарміраваліся на працягу другой паловы XIX – першай трэці XX ст. Ініцыятыва прыватных калекцыянераў у стварэнні музея тлумачыцца высокім узроўнем

грамадскай свядомасці, глыбокімі патрыятычнымі пачуццямі ў дачыненні да роднага горада.

Трэцяя група музеяў гісторыі горада створана па ініцыятыве грамадскіх аб'яднанняў. У сярэдзіне XIX ст. – пачатку XX ст. дзейнічала вялікая колькасць археалагічных, антыкварных, філасофскіх таварыстваў, члены якіх цікавіліся лакальнай гісторыяй і культурай. Такія таварыствы пачынаюць уцягвацца ў дзейнасць па стварэнні музеяў гісторыі горада, так узніклі Гарадскі музей Осла (1905 г.), Музей Загрэба (1906 г.), Музей Старога Пецярбурга (1908 г.).

Такім чынам, можна вылучыць наступныя фактары стварэння музеяў гісторыі горада: фарміраванне нацый, рост гарадоў і гарадскога насельніцтва, фарміраванне новых дзяржаў і новых сталіц, развіццё руху за нацыянальнае адраджэнне. Грамадская неабходнасць у дзейнасці музеяў гісторыі горада абумоўлена патрэбай гарадскога соцыуму ў фарміраванні і захаванні сваёй ідэнтычнасці.

**У раздзеле 2.2 «Музеі гісторыі горада ў Беларусі: вопыт стварэння і спецыфіка дзейнасці»** раскрыта эвалюцыя беларускіх музеяў гісторыі горада.

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць сем музеяў гісторыі горада: Музей гісторыі і культуры горада Наваполацка (1968 г.), Музей гісторыі і культуры горада Оршы (заснаваны ў 1989 г., адкрыты ў 1992 г.), Музей гісторыі горада Брэста (заснаваны ў 1990 г., адкрыты ў 1998 г.), Музей гісторыі горада Магілёва (заснаваны ў 1990 г., адкрыты ў 2002 г.), Музей гісторыі горада Гомеля (2009 г.), Музей гісторыі горада Мінска (2010 г.), Давыд-Гарадоцкі музей гісторыі горада (2018 г.).

Абапіраючыся на храналогію стварэння музеяў гісторыі горада можна адзначыць, што беларускія музеі развіваліся адпаведна агульнаеўрапейскім тэндэнцыям. На першым этапе (1860-я гг. – 1918 г.) намаганнямі Таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі быў створаны Мінскі гарадскі музей (1912 г.). Гэты працэс быў дэтэрмінаваны ўрбанізацыяй: ператварэннем Мінска ў буйны эканамічны цэнтр рэгіёна, развіццём транспартнай інфраструктуры, а таксама звязаны з ростам нацыянальнай самасвядомасці. У 1915 г. музей спыніў сваю дзейнасць у сувязі з падзеямі Першай сусветнай вайны. У 1919–1945 гг. актуальнай з'яўлялася тэндэнцыя арганізацыі гарадскіх музеяў намаганнямі прыватных асоб. Так, на тэрыторыі Заходняй Беларусі Т. Жук-Рыбіцкі займаўся стварэннем Музея гісторыі горада Брэста. Фарміраванне музея спынена з пачаткам Другой сусветнай вайны.

Большасць сучасных музеяў гісторыі горада Беларусі створана ў 1990-я гг. – пачатку XXI ст., за выключэннем Музея гісторыі і культуры горада Наваполацка, адкрытага ў 1968 г., праз 10 гадоў пасля заснавання горада. Адметнасць установы заключаецца ў тым, што развіццё горада і музея адбываецца паралельна. Гэта падкрэслівае адну са спецыфічных задач музея

гісторыі горада – арыентацыя не толькі на мінулае, але і на сучаснасць.

Экспазіцыі беларускіх музеяў гісторыі горада адлюстроўваюць асноўныя гістарычныя перыяды развіцця горада, розныя аспекты гарадскога жыцця (мастацтва, літаратура, эканоміка). Адной з галоўных задач музеяў дадзенай групы з’яўляецца выхаванне ў гараджан патрыятызму і любові да роднага горада, папулярызацыя яго гісторыі і культуры. Дзейнасць музеяў гісторыі горада непарыўна звязана з работай гарадской адміністрацыі.

**У раздзеле 2.3 «Музеефікацыя гістарычных аб’ектаў як дэтэрмінанта дзейнасці Музея гісторыі горада Мінска»** разглядаецца гісторыя станаўлення сталічнага музея горада, які ўзнік у пачатку XXI ст., але першыя намаганні па яго стварэнні былі ажыццёўлены ў пачатку XX ст., працягнуты ў міжваенны перыяд і ў 1970–1980-я гг. Аналізуецца дзейнасць музея па музеефікацыі аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Мінска праз стварэнне тэматычных экспазіцый. Пранікненне музея ў асяроддзе Верхняга горада адбываецца наступным чынам:

– ствараюцца філіялы, якія дакументуюць асобныя аспекты жыцця гарадскога арганізма і забяспечваюць музейнае выкарыстанне і інтэрпрэтацыю архітэктурных помнікаў і ансамбляў, сярод іх такія структурныя падраздзяленні, як Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага ў будынку былой гарадской сядзібы канца XVIII ст., Гарадская мастацкая галерэя твораў Л. Д. Шчамялёва ў будынку – помніку архітэктуры XIX ст., адноўлены будынак Мінскай гарадской ратушы, комплекс музеяў на тэрыторыі былога кляштара бернардзінцаў;

– ажыццяўляецца рознаўзроўневая музеефікацыя гарадскога асяроддзя, якая ўключае выяўленне і інтэрпрэтацыю гістарычнай, культурнай, мемарыяльнай каштоўнасці розных аб’ектаў з дапамогай частковай рэканструкцыі. Структурныя падраздзяленні Музея гісторыі гарада Мінска знаходзяцца ў помніках архітэктуры, якія былі рэканструяваны пад музейныя будынкі як з улікам патрабаванняў музея, так і зыходзячы з іх першаснага гістарычнага прызначэння;

– гарадская прастора шырока выкарыстоўваецца ў розных відах музейнай дзейнасці. Прыкладам могуць служыць шматлікія мерапрыемствы на прылеглай да музея тэрыторыі: рыцарскія і музычныя фэсты, выставачныя праекты пад адкрытым небам, пешаходны культурна-адукацыйны маршрут па аб’ектах Верхняга горада.

**У трэцяй главе «Камунікатыўныя практыкі музеяў гісторыі горада»** прыведзена аўтарская класіфікацыя напрамкаў камунікатыўнай дзейнасці ў музеі гісторыі горада, вылучаны сучасныя тэндэнцыі іх развіцця.

**У раздзеле 3.1 «Напрамкі камунікатыўнай дзейнасці ў музеі гісторыі горада»** на падставе сучасных даследаванняў музейнай камунікацыі

прапаноўваюцца наступныя яе напрамкі: камунікацыя з наведвальнікамі і з інстытуцыямі. Група наведвальнікаў складаецца з рэальнай аўдыторыі музея, патэнцыйных наведвальнікаў, віртуальных наведвальнікаў. Да інстытуцый можна аднесці: органы ўлады, дзяржаўныя ўстановы, камерцыйныя ўстановы, міжнародныя арганізацыі, грамадскія арганізацыі, сродкі масавай інфармацыі, турыстычныя кампаніі, нефармальныя аб’яднанні.

Рэальную аўдыторыю складаюць людзі, якія наведваюць музеі. Для музеяў гісторыі горада актуальным застаецца пытанне падзелу аўдыторыі на гараджан і гасцей горада. Гэта ўплывае на падыходы да пабудовы экспазіцыі і выкарыстанне форм культурна-адукацыйнай работы. Асноўным каналам камунікацыі з рэальнай аўдыторыяй выступае экспазіцыя. Галоўнай адметнасцю экспазіцыі музеяў гісторыі горада з’яўляецца аб’ект паказу – горад. Камунікацыя ў прасторы музейнай экспазіцыі доўгі час заставалася аднабаковай, аднак сучасныя тэхналогіі дазваляюць зрабіць экспазіцыю інтэрактыўнай. Можна вылучыць наступныя формы зваротнай сувязі: водгукі; удзел у акцыях, распрацаваных музеем; узаемадзеянне з музеем з дапамогай сродкаў мультымедыя.

Культурна-адукацыйная дзейнасць музея дапаўняе экспазіцыйна-выставачную работу. Адукацыйныя праграмы музея гісторыі горада часцей звернуты менавіта на пастаяннага жыхара, а не гасцей горада, таму што разлічаны на доўгае, паглыбленае, перыядычнае ўзаемадзеянне і пранікненне ў кола тэм, якія цікавяць гараджан. Музей гісторыі горада прэтэндуе на ролю форуму для абмеркавання і прэзентацыі адкрыццяў, новых ведаў пра горад.

Да групы патэнцыйных наведвальнікаў музея можна аднесці жыхароў горада. У XXI ст. тэма пашырэння межаў музеяў набыла высокую папулярнасць. Іх дзейнасць стала больш адкрытай, што праяўляецца ў выхадзе ў прастору горада. Формамі работы з гараджанамі могуць выступаць выстаўкі пад адкрытым небам і праекты па-за межамі музея; вулічныя фестывалі; гарадскія квэсты; пешаходныя гарадскія экскурсіі; мерапрыемствы на прылеглай да музея тэрыторыі.

Актуальным напрамкам камунікацыі выступае ўзаемадзеянне з віртуальнымі наведвальнікамі. Ва ўмовах паскораных тэмпаў інфарматызацыі музеі вымушаны, адначасова з традыцыйнымі формамі і метадамі работы, выкарыстоўваць інтэрнэт-тэхналогіі. Перад музеямі ўзнікаюць новыя задачы, як стварэнне віртуальных выставак, электронных каталогаў, рэестраў культурнай спадчыны, даступных для шырокіх колаў насельніцтва.

Камунікацыя музея з інстытуцыямі з улікам іх разнастайнасці і спецыфікі розных сфер дзейнасці, зводзіцца да наступных узаемадзеянняў: сацыяльнага партнёрства, інфраструктурных рыначных паслуг, абмену інфармацыяй, арганізацыі сумесных праектаў.

Такім чынам, галоўным суб’ектам у працэсе музейнай камунікацыі выступае індывід – наведвальнік. Усё астатняе мноства камунікацый, якія наладжвае музей, накіравана на пашырэнне рэальнай аўдыторыі.

**У раздзеле 3.2 «Тэндэнцыі развіцця камунікатыўных практык сучасных музеяў гісторыі горада»** праведзены аналіз дзейнасці музеяў гісторыі горада, які выявіў актуальныя тэндэнцыі іх развіцця. Галоўнай тэндэнцыяй з’яўляецца пашырэнне аб’екта даследавання музея з мінулага горада на яго сучаснасць і будучыню, што прыВяло да актывізацыі камунікатыўных працэсаў і знайшло ўвасабленне ў экспазіцыйнай дзейнасці, новых формах работы з наведвальнікамі (інтэрактыўныя выстаўкі і экскурсіі, пешаходныя туры па горадзе, анлайн-праекты).

Другой важнай тэндэнцыяй з’яўляецца рост камунікатыўных узаемадзеянняў з усімі суб’ектамі, якія так ці інакш звязаны з развіццём горада і турызму. Сумесныя праекты з гарадскімі ўладамі, установамі адукацыі, бібліятэкамі, іншымі музеямі спрыяюць пашырэнню аўдыторыі, паляпшаюць якасць работы з наведвальнікамі, умацоўваюць сувязі з гараджанамі.

Яшчэ адной актуальнай тэндэнцыяй развіцця музеяў гісторыі горада з’яўляецца імкненне прыцягнуць да сваёй дзейнасці жыхароў горада, не толькі як пасіўных сузіральнікаў і наведвальнікаў, але і як актыўных удзельнікаў, ствараючы такім чынам кола добраахвотных памочнікаў, што ўзмацняе ў гарадской супольнасці пачуццё дачынення да гісторыі і спадчыны горада.

Актуальным застаецца выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій, мультымедыя, сацыяльных сетак. Гэта дазваляе зрабіць музей больш цікавым і даступным для шырокага кола наведвальнікаў, значана павысіць эфектыўнасць інтэрпрэтацыі спадчыны, ствараць новыя камунікатыўныя інструменты, якія садзейнічаюць пашырэнню аўдыторыі.

Сучаснай тэндэнцыяй развіцця музеяў гісторыі горада з’яўляецца выкарыстанне гарадской прасторы для рэалізацыі культурна-адукацыйных праектаў. Формамі такой работы выступаюць выстаўкі пад адкрытым небам і праекты па-за межамі музея на базе прадпрыемстваў, транспарту; вулічныя фестывалі; гарадскія квэсты; пешаходныя гарадскія экскурсіі; лекцыі, кінапрагляды, мерапрыемствы з канцэртнай праграмай на прылеглай да музея тэрыторыі.

У Беларусі музеі гісторыі горада складаюць невялікую групу, таму часткова іх функцыі пачалі выконваць краязнаўчыя музеі. Аналіз дзейнасці краязнаўчых музеяў выявіў тэндэнцыю да змены вектару іх увагі з рэгіёна на горад, што праяўляецца ў экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці. Інтэрпрэтацыя гарадской гісторыі і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны гарадоў краязнаўчымі музеямі сведчыць пра высокі ўзровень урбанізацыі і фарміраванне ўстойлівай гарадской супольнасці.

Такім чынам, сучасныя тэндэнцыі развіцця камунікатыўных практык у музеях гісторыі горада накіраваны на стварэнне інтэрактыўнага музейнага вопыту для наведвальнікаў, пашырэнне аўдыторыі музея, павышэнне яго значнасці для гараджан і развіццё культурнага жыцця горада ў цэлым.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. Музеі гісторыі горада можна лічыць спецыфічнай групай музеяў, аб’ектам вывучэння якіх выступае горад. Характэрнымі рысамі музеяў гісторыі горада з’яўляюцца: разнародны склад калекцый, арыентацыя на фарміраванне гарадской камунікатыўнай платформы ў прасторы музея, гарадское падпарадкаванне, шматграннасць тэм экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці, сувязь з культурным асяроддзем горада, поліфункцыянальнасць.

У міжнароднай музейнай супольнасці адсутнічае адзіная дэфініцыя паняцця «музей гісторыі горада» або «музей горада». Гэта абумоўлена тым, што дадзеная група музеяў перажывае перыяд трансфармацыі: фарміраванне новых функцый праз рост камунікатыўнай актыўнасці ў сацыякультурнай прасторы, змена зместу дзейнасці праз актуалізацыю сучасных праблем горада, пошук новых формаў прэзентацыі гарадской гісторыі. Акрамя таго, паміж музеямі дадзенай групы назіраюцца значныя адрозненні, што ўскладняе спробы ўніфікаваць іх змест у адзіным вызначэнні.

Вылучаюцца дзве катэгорыі музеяў гісторыі горада: традыцыйныя і сучасныя. Да першай адносяцца тыя музеі, якія арыентуюцца на дакументаванне і інтэрпрэтацыю мінулага горада. Як правіла, яны захоўваюць класічны падыход да прэзентацыі гарадской гісторыі па хsvhраналагічным прынцыпе. Яны набліжаны да гістарычных музеяў па характары дзейнасці і змяшчаюць у сваёй назве слова «гісторыя». Другая катэгорыя музеяў арыентавана на дакументаванне і інтэрпрэтацыю не толькі мінулага, але і сучаснасці горада. Тэматыка і змест іх экспазіцыйнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці ахопліваюць розныя аспекты гарадскога жыцця: экалогія, міграцыя і склад насельніцтва, сацыяльныя праблемы, архітэктура і горадабудаўніцтва, узаемасувязь паміж мінулым і сучасным станам горада. У назве такіх музеяў слова «гісторыя» адсутнічае, а па характары сваёй дзейнасці яны набліжаны да музеяў комплекснага профілю. Абедзве вылучаныя катэгорыі музеяў аб’ядноўвае іх прызначэнне, якое заключаецца ў выяўленні ўнікальнасці канкрэтнага горада. Як сацыякультурны інстытут музей гісторыі горада дакументуе, даследуе, захоўвае, інтэрпрэтуе, дэманструе гарадскую гісторыка-культурную спадчыну, гарадскую гісторыю і сучаснасць, матэрыяльную і духоўную культуру, лад жыцця гараджан.

У аснове аўтарскай дэфініцыі паняцця «музей гісторыі горада» – інстытуцыянальны падыход (сацыякультурны інстытут), галоўныя функцыі ўстановы (дакументаванне, даследаванне, захаванне, інтэрпрэтацыя), спецыфічны аб'ект даследавання (горад), задачы, якія вылучаюць дадзены тып музея сярод іншых (выяўленне ўнікальнасці і ідэнтычнасці горада) [2; 3].

2. Музеі гісторыі горада пачалі з'яўляцца пад уплывам такіх сацыякультурных працэсаў, як урбанізацыя і рост гарадскога насельніцтва. Іх развіццё было абумоўлена перабудовай і мадэрнізацыяй гарадской забудовы, грамадскай неабходнасцю захавання гісторыка-культурнай спадчыны горада, пашырэннем адукацыі і фарміраваннем ідэнтычнасці гараджан. Ініцыятыва стварэння музеяў гісторыі горада належала гарадскім уладам, калекцыянерам, грамадскім актывістам краязнаўчых і навуковых таварыстваў.

Вылучаны наступныя перыяды развіцця еўрапейскіх музеяў гісторыі горада: 1860-я гг. – 1918 г., 1919–1945 гг., 1946–1991 гг., 1992 г. – пачатак XXI ст. На працягу ўсяго часу існавання назіраецца эвалюцыя музеяў гісторыі горада, кожны перыяд характарызуецца спецыфічнымі асаблівасцямі.

У перыяд з 1860-х гг. да 1918 г. у адказ на імклівую індустрыялізацыю і працэсы ўрбанізацыі пачалі з'яўляцца першыя музеі гісторыі горада як галерэі мясцовай гісторыі і сродак захавання гісторыка-культурнай спадчыны горада. Яны развіваліся ў двух напрамках: ажыццяўлялі камплектаванне фондаў музея прадметамі, звязанымі з мінулым горада; стваралі першыя экспазіцыі, якія дэманстравалі гісторыю горада праз творы мастацтва, прадметы побыту, археалагічныя артэфакты.

У 1919–1945 гг. рост музеяў гісторыі горада звязаны з узнікненнем новых дзяржаў, дзе назіраўся ўздым нацыянальнай самасвядомасці. Музеі гісторыі горада сталі важным фактарам фарміравання патрыятычных пачуццяў насельніцтва. У час Другой сусветнай вайны многія музеі пацярпелі, аднак пасля вайны пачалі аднаўляцца і сталі цэнтрамі культурнага жыцця гарадоў.

У 1946–1991 гг. музеі гісторыі горада спачатку ствараліся паралельна з працэсамі пасляваеннага аднаўлення і рэканструкцыі, з 1970-х гг. адзначаецца развіццё новых экспазіцыйных падыходаў да інтэрпрэтацыі горада і гарадской гісторыі ў музеі. Адбылося пашырэнне тэматычнага спектра музейных экспазіцый, больш увагі стала надавацца сацыяльным і культурным зменам у горадзе.

З 1992 г. і да нашага часу працягваецца з'яўленне музеяў гісторыі горада. Гэты перыяд адзначаны пераарыентацыяй музея з мінулага горада на сучаснасць у адказ на працэсы пераходу ад індустрыяльнага да постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства. Адным з галоўных напрамкаў развіцця музеяў гісторыі горада стаў рост узаемадзеянняў з наведвальнікамі і выкарыстанне новых тэхналогій у экспазіцыях і культурна-

адукацыйных праграмах [3; 15].

3. Станаўленне музеяў гісторыі горада на тэрыторыі Беларусі адбывалася ў рамках агульнаеўрапейскіх тэндэнцый. У першай палове XX ст. значны ўплыў на працэс развіцця музейнай сеткі зрабілі падзеі сусветнага значэння. Дзейнасць Мінскага гарадскога музея спынілася ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі Першай сусветнай вайны, стварэнне Музея гісторыі горада Брэста перарвана з пачаткам Другой сусветнай вайны. Функцыі дакументавання мясцовай гісторыі выконвалі краязнаўчыя музеі, з'яўленне якіх звязана з пашырэннем краязнаўчага руху. У другой палове XX ст. рабіліся неаднаразовыя спробы заснавання Музея гісторыі горада Мінска. Імклівы рост горада і гарадскога насельніцтва ў дадзены перыяд адбываўся за кошт міграцыі, гарадская супольнасць знаходзілася на стадыі фарміравання, таму працэс стварэння музея не быў паспяховым.

Адкрыццё большасці музеяў гісторыі горада адбылося ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь у перыяд з 1992 г. да пачатку XXI ст. Сучасная тэндэнцыя пераарыентацыі з вывучэння гісторыі горада на яго ўсебаковае даследаванне як складанай сацыякультурнай з'явы праяўляецца ў пошуку новых падыходаў да адлюстравання вобраза горада ў экспазіцыі, разнастайных тэматычных выставачных праектах. Тэндэнцыя пашырэння камунікатыўных практык назіраецца ў шматграннасці формаў культурна-адукацыйнай работы, актывізацыі ўзаемадзеяння з мясцовымі супольнасцямі гараджан, выкарыстанні сучасных інфармацыйных тэхналогій і сацыяльных сетак. Рост уплыву на гарадскую сацыякультурную прастору праз засваенне музеем тэрыторыі горада знаходзіць выражэнне ў музеефікацыі гістарычных будынкаў, стварэнні разгалінаванай сеткі філіялаў, у выставачных і культурна-адукацыйных праектах пад адкрытым небам [1; 7; 10; 13].

4. Музей гісторыі горада – гэта складаная камунікатыўная сістэма. Яго спецыфічнай уласцівасцю з'яўляецца магчымасць выконваць розныя ролі ў камунікатыўным працэсе: суб'ект (паўнавартасны ўдзельнік камунікацыі), аб'ект (тое, на што накіравана камунікацыя), прастора (дыялогавая пляцоўка камунікацыі). Актуальнай тэндэнцыяй у развіцці сучасных музеяў гісторыі горада з'яўляецца іх ператварэнне ў прастору дыялогу паміж гарадскімі супольнасцямі, гараджанамі і органамі ўлады, мінулым і сучаснасцю.

У музеі гісторыі горада вылучаюцца два асноўныя напрамкі камунікатыўнай дзейнасці: з наведвальнікамі (рэальнымі, патэнцыйнымі, віртуальнымі) і з інстытуцыямі (установамі, арганізацыямі). Асаблівасці камунікацыі з наведвальнікамі праяўляюцца ў выкарыстанні сучасных тэхналогій, якія павышаюць інтэрактыўнасць экспазіцый; мультымедыя для больш эфектыўнай перадачы інфармацыі; сацыяльных медыя, што спрыяе атрыманню зваротнай сувязі. Камунікацыя музея гісторыі горада з

інстытуцыямі праяўляецца праз рэалізацыю сумесных праектаў, накіраваных на захаванне і папулярызацыю гарадской гісторыка-культурнай спадчыны.

Музеі гісторыі горада выкарыстоўваюць традыцыйныя і спецыфічныя камунікатыўныя практыкі, якія пашыраюць пранікненне музея ў гарадское асяроддзе, спрыяюць фарміраванню супольнасці сяброў музея і росту яго аўдыторыі, павышаюць ступень удзелу музея ў агульнагарадскіх працэсах, павялічваюць турыстычны патэнцыял музея і яго ролю ў эканоміцы горада, ствараюць умовы камплектавання фондаў музея новымі прадметамі і вуснымі гісторыямі, уплываюць на фарміраванне ідэнтычнасці гараджан.

У выніку ўзаемадзеяння музея з навакольнай сацыякультурнай прасторай утвараецца спецыфічная форма музейнай камунікацыі са зваротнай сувяззю. Музей займае пэўнае фізічнае становішча ў горадзе і ўключаны ў яго дынамічную сацыякультурную прастору. Уплыў музея ўзрастае з павышэннем яго ролі як сацыякультурнага цэнтра горада [4; 5; 6; 8; 9; 11; 12; 14; 16; 17].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Практычная значнасць атрыманых вынікаў пацвярджаецца актамі ўкаранення вынікаў даследавання ў культурна-адукацыйную дзейнасць дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска» (ад 14.03.2017; 22.03.2017; 23.05.2017; 20.05.2018; 20.05.2019; 02.09.2020), выдавецкую дзейнасць дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска» (20.03.2017); навукова-фондавую дзейнасць дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска» (23.05.2021); экспазіцыйна-выставачную дзейнасць структурнага падраздзялення Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага і выставачных залаў дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска» (28.08.2020; 24.11.2022).

Высновы даследавання могуць быць выкарыстаны для распрацоўкі канцэпцыі развіцця музеяў гісторыі горада ў Беларусі, пабудовы стратэгіі камунікацыі, для вырашэння практычных пытанняў у дзейнасці музеяў, якія вывучаюць тэму горада. Прадстаўленыя ў дысертацыі палажэнні могуць скласці тэарэтычную і фактаалагічную аснову пры распрацоўцы вучэбных курсаў па гарадскому краязнаўству, сацыякультурнай дзейнасці, музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны горада.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

### Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных выданнях

1. Кавалёва, Ю. В. Дзейнасць Музея гісторыі горада Мінска па музеефікацыі аб'ектаў Верхняга горада / Ю. В. Кавалёва // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2018. – № 1. – С. 169–177.

2. Кавалёва, Ю. В. Пошук і трансфармацыя дэфініцыі «музей горада» / Ю. В. Кавалёва // Искусство и культура. – 2020. – № 3. – С. 47–53.

3. Кавалёва, Ю. В. Гістарыяграфія музеяў гісторыі гарадоў / Ю. В. Кавалёва // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2021. – № 1. – С. 135–145.

4. Кавалёва, Ю. В. Музеі гісторыі гарадоў Беларусі: узроўні камунікацыі / Ю. В. Кавалёва // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2022. – № 1. – С. 107–117.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

5. Кавалёва, Ю. В. Значэнне і роля віртуальнага музея ў сусветнай інфармацыйнай прасторы / Ю. В. Кавалёва // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2008. – Вып. 5. – С. 507–509.

6. Ковалёва, Ю. В. Музей истории города Минска в пространстве Интернета / Ю. В. Ковалёва // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, Белорус. гос. акад. музыки, Белорус. гос. акад. искусств. – Минск, 2016. – Вып. 10. – С. 134–136.

7. Кавалёва, Ю. В. Комплекс музеяў на тэрыторыі былога бернардзінскага кляштара ў Мінску: вопыт стварэння экспазіцыі / Ю. В. Кавалёва // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, Белорус. гос. акад. музыки, Белорус. гос. акад. искусств. – Минск, 2017. – Вып. 11. – С. 211–215.

8. Кавалёва, Ю. В. Музейнае свята як форма рэвіталізацыі памятнай даты ў гісторыі Мінска / Ю. В. Кавалёва // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, Белорус. гос. акад. музыки, Белорус. гос. акад. искусств. – Минск, 2018. – Вып. 12. – С. 258–262.

9. Ковалёва, Ю. В. Музейный праздник как форма ревитализации памятной даты в истории Минска / Ю. В. Ковалёва // Материалы VIII Всерос. науч.-практ. конф. «Родной край: история и современность» : сб. ст. / Ист.-краевед. музей ; отв. ред. Р. В. Булатова ; ред.-сост. Г. Т. Салахатдинова. – Набережные Челны, 2018. – С. 77–79.

10. Кавалёва, Ю. В. Музеі гісторыі гарадоў Беларусі: шляхі станаўлення і развіцця / Ю. В. Кавалёва // Музейны веснік : зборнік / Нац. гіст. музей Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2018. – Вып. 6. – С. 8–15.

11. Кавалёва, Ю. В. Тэма малой радзімы ў выставачнай і асветніцкай дзейнасці Музея гісторыі горада Мінска / Ю. В. Кавалёва // Культура Беларуси: реалии современности : VIII Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. Году малой родины в Республике Беларусь, Минск, 10 окт. 2019 г. : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: А. А. Корбут (пред.) [и др.]. – Минск, 2019. – С. 209–213.

12. Кавалёва, Ю. В. Навукова-асветніцкая дзейнасць музеяў ва ўмовах пандэміі / Ю. В. Кавалёва // Культура Беларуси: реалии современности : IX Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 45-летию учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск, 8 окт. 2020 г. : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: Н. В. Карчевская (пред.) [и др.]. – Минск, 2020. – С. 189–193.

13. Кавалёва, Ю. В. Перадумовы стварэння музея гісторыі горада Мінска / Ю. В. Кавалёва // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, Белорус. гос. акад. музыки, Белорус. гос. акад. искусств. – Минск, 2021. – Вып. 15. – С. 127–131.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

14. Ковалёва, Ю. В. Комплектование коллекции «Предметы быта горожан второй половины XX века» в Музее истории города Минска / Ю. В. Ковалёва // Миссия антропологии и этнологии: научные традиции и современные вызовы : XII Конгр. антропологов и этнологов России, Ижевск, 3–6 июля 2017 г. : сб. материалов / Ин-т этнологии и антропологии Рос. акад. наук [и др.] ; редкол.: А. Е. Загребин [и др.]. – М. : Ижевск, 2017. – С. 67.

15. Ковалёва, Ю. В. Первые музеи истории городов: пути становления и развития / Ю. В. Ковалёва // Слова. Кніга. Лёс. Творчая і грамадская дзейнасць Янкі Купалы ў кантэксце беларускай асветніцкай традыцыі : XII Міжнар. Купал. чытанні, прысвеч. 135-гадоваму юбілею Я. Купалы, Мінск, 10 кастр. 2017 г. / Дзярж. літ. музей Я. Купалы, Міжнар. фонд Я. Купалы ; уклад. Г. Ю. Варонава ; рэдкал.: А. Р. Ляшковіч (гал. рэд.), В. П. Рагойша, Н. С. Стрыбульская. – Мінск, 2017. – С. 144–147.

16. Кавалёва, Ю. В. Выкарыстанне сацыяльных сетак як камунікатыўнай прасторы ў дзейнасці Музея гісторыі горада Мінска / Ю. В. Кавалёва // Библиотеки и музеи в современной образовательной и социокультурной среде: сохранение традиций и перспективы развития : материалы Междунар. науч-практ. конф., посвящ. 75-летию фак. информ.-док. коммуникаций Белорус. гос. ун-та культуры и искусств, Минск, 24–26 сент. 2019 г. : в 2 ч. / Белорус. гос.

ун-т культуры и искусств ; науч. ред. В. Р. Языкович. – Минск, 2019. – Ч. 2. – С. 32–35.

17. Ковалёва, Ю. В. Сотрудничество между Музеем истории города Минска и Белорусским государственным архивом научно-технической документации: опыт организации совместных выставок / Ю. В. Ковалёва // Научно-техническая документация в современном мире: роль, значение, перспектива : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 50-летию со дня основания Белорус. гос. арх. науч.-техн. документации, Минск, 24 мая 2018 г. / Белорус. гос. арх. науч.-техн. документации, Белорус. о-во архивистов ; редкол.: А. М. Запартыко [и др.]. – Минск, 2020. – С. 32–36.

## РЭЗЮМЭ


## КАВАЛЁВА ЮЛІЯ ВІКТАРАЎНА


## МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА Ў СУЧАСНАЙ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ: КАМУНІКАТЫЎНЫ АСПЕКТ


**Ключавыя словы:** музей гісторыі горада, музей горада, сацыякультурная прастора, музеефікацыя гарадской прасторы, камунікатыўныя практыкі музеяў

**Мэта даследавання:** выявіць асаблівасці камунікатыўнай дзейнасці музея гісторыі горада ў сучаснай сацыякультурнай прасторы.

**Аб’ект даследавання** – музей гісторыі горада.

**Прадмет даследавання** – камунікатыўны аспект дзейнасці музея гісторыі горада ў сучаснай сацыякультурнай прасторы.

**Метады даследавання.** Дысертацыйнае даследаванне грунтуецца на міждысцыплінарным падыходзе, што дазволіла комплексна разгледзець дзейнасць музея гісторыі горада ў сучаснай сацыякультурнай прасторы. Выкарыстаны наступныя метады: тыпалагізацыя, гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, структурна-функцыянальны, семіятычны, аксіялагічны, дыяхранічны, сінхранічны, дыялектычны, культурна-антрапалагічны.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Удакладнена паняцце «музей гісторыі горада», ахарактарызаваны яго спецыфічныя асаблівасці. Вылучаны і ахарактарызаваны асноўныя перыяды станаўлення і развіцця музеяў гісторыі горада, выяўлены фактары іх узнікнення. Вызначаны напрамкі камунікатыўнай дзейнасці музея гісторыі горада ў сучаснай сацыякультурнай прасторы. Прааналізаваны вопыт камунікатыўных практык музеяў гісторыі горада ў Беларусі.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Высновы даследавання могуць быць выкарыстаны для распрацоўкі канцэпцыі развіцця музеяў гісторыі горада ў Беларусі, пабудовы стратэгіі камунікацыі, для вырашэння практычных пытанняў дзейнасці музеяў, якія вывучаюць тэму горада. Прадстаўленыя ў дысертацыі палажэнні могуць скласці тэарэтычную і факталагічную аснову пры распрацоўцы вучэбных курсаў па гарадскому краязнаўству, сацыякультурнай дзейнасці, музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны горада.

**Галіна выкарыстання:** музеязнаўства, тэорыя і гісторыя культуры, краязнаўства, гісторыя Беларусі, ахова гісторыка-культурнай спадчыны.

# РЕЗЮМЕ

## КОВАЛЁВА ЮЛИЯ ВИКТОРОВНА

## МУЗЕЙ ИСТОРИИ ГОРОДА В СОВРЕМЕННОМ СОЦИОКУЛЬТУРНОМ ПРОСТРАНСТВЕ: КОММУНИКАТИВНЫЙ АСПЕКТ

**Ключевые слова:** музей истории города, музей города, социокультурное пространство, музеефикация городского пространства, коммуникативные практики музеев

**Цель исследования:** раскрыть особенности коммуникативной деятельности музея истории города в современном социокультурном пространстве.

**Объект исследования** – музей истории города.

**Предмет исследования** – коммуникативный аспект деятельности музея истории города в современном социокультурном пространстве.

**Методы исследования.** В основу диссертационного исследования положен междисциплинарный подход, позволивший комплексно рассмотреть деятельность музея истории города в современном социокультурном пространстве. Используются следующие методы: типологизация, историко-генетический, историко-сравнительный, структурно-функциональный, семиотический, аксиологический, диахронический, синхронический, диалектический, культурно-антропологический.

**Полученные результаты и их новизна.** Уточнено понятие «музей истории города», описываются его специфические черты. Выделены и охарактеризованы основные периоды становления и развития музеев истории города, выявлены причины их возникновения. Определены направления коммуникативной деятельности музея истории города в современном социокультурном пространстве. Анализируется опыт коммуникативных практик музеев истории города в Беларуси.

**Рекомендации по использованию.** Выводы исследования могут быть использованы для разработки концепции развития музеев истории города в Беларуси, построения коммуникационной стратегии, решения практических вопросов деятельности музеев, изучающих тему города. Представленные в диссертации положения могут стать теоретической и фактологической основой для разработки образовательных курсов по городскому краеведению, социально-культурной деятельности, музеефикации историко-культурного наследия города.

**Область использования:** музееведение, теория и история культуры, краеведение, история Беларуси, охрана историко-культурного наследия.

## SUMMARY

## YULIYA KOVALIOVA

## MUSEUM OF THE HISTORY OF THE CITY IN A MODERN SOCIO-CULTURAL SPACE: A COMMUNICATIVE ASPECT

**Keywords:** museum of the history of the city, city museum, sociocultural space, museumification of city space, museum communication practices

**The purpose of the research:** to reveal the features of the communicative activity of the museum of the history of the city in the modern socio-cultural space.

**The object of research** is the museum of the history of the city.

**The subject of the research** is the communicative aspect of the activity of the museum of the history of the city in the modern socio-cultural space.

**The methods of the research.** The dissertation research is based on an interdisciplinary approach, which made it possible to comprehensively consider the activities of the museum of the history of the city in the modern socio-cultural space. The following methods are used: typology, historical-genetic, historical-comparative, structural-functional, semiotic, axiological, diachronic, synchronic, dialectical, cultural-anthropological.

**The results of the research and their scientific novelty.** Clarified the concept of «Museum of the history of the city», its specific features are described. The main periods of formation and development of museums of the history of the city are singled out and characterized, the reasons for their occurrence are identified. The directions of communicative activity of the museum of the history of the city in the modern socio-cultural space are determined. The experience of communicative practices of museums of the history of the city in Belarus is analyzed.

**Practical application.** The findings of the study can be used to develop a concept for the development of museums of the history of the city in Belarus, build a communication strategy, and solve practical issues in the activities of museums that study the theme of the city. The provisions presented in the dissertation can become a theoretical and factual basis for the development of educational courses on urban local history, socio-cultural activities, museumification of the historical and cultural heritage of the city.

**Scope:** museum science, theory and history of culture, local history, the history of Belarus, protection of historical and cultural heritage.

Навуковае выданне

**КАВАЛЁВА ЮЛІЯ ВІКТАРАЎНА**

# МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА Ў СУЧАСНАЙ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ: КАМУНІКАТЫЎНЫ АСПЕКТ

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі па спецыяльнасці
24.00.03 – музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя
гісторыка-культурных аб’ектаў

Падпісана ў друк 22.03.2023. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,40. Ул.-выд. арк. 1,52.
Тыраж 60 экз. Заказ 799.

Паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Минск.